**Аб змяненні законаў па пытаннях гаспадарчых таварыстваў**

З 28 красавіка 2021 г. уступілі ў сілу змяненні ў законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях гаспадарчых таварыстваў.

У адпаведнасці з артыкулам 5 Закона Рэспублікі Беларусь ад 5 студзеня 2021 г. «Аб змяненні законаў па пытаннях гаспадарчых таварыстваў» гаспадарчыя таварыствы, зарэгістраваныя да ўступлення яго ў сілу, пры першым пасля ўступлення ў сілу ўнясенні змяненняў і (або) дапаўненняў у свае статуты абавязаны прывесці іх у адпаведнасць з дадзеным Законам.

**Аб змяненні законаў па пытаннях фізічнай культуры і спорту**

Законам Рэспублікі Беларусь ад 19 ліпеня 2022 г. № 200-З «Аб змяненні законаў па пытаннях фізічнай культуры і спорту» (далей - Закон № 200-З) прадугледжана, што з 1 ліпеня 2023 г. індывідуальныя прадпрымальнікі і арганізацыі недзяржаўнай формы ўласнасці падлягаюць дзяржаўнай акрэдытацыі на права ажыццяўлення дзейнасці па развіццю фізічнай культуры і спорту.

Дзяржаўныя органы і іншыя арганізацыі, за якімі замацаваны паўнамоцтвы на правядзенне дзяржаўнай акрэдытацыі на права ажыццяўлення дзейнасці па развіццю фізічнай культуры і спорту і пацвярджэнне гэтай дзяржаўнай акрэдытацыі, вызначаны ў пункце 4 артыкула 15-1 Закона Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2014 г. № 125- З «Аб фізічнай культуры і спорце».

Арганізацыі фізічнай культуры і спорту, зарэгістраваныя да ўступлення ў сілу Закона № 200-З, пры першым пасля ўступлення ў сілу ўказанага Закона ўнясенні змяненняў у свае статуты абавязаны прывесці іх у адпаведнасць з пунктам 14 артыкула 2 Закона № 200-З ,але не пазней за два гадоў з дня ўступлення ў сілу гэтага Закона. Да прывядзення ў адпаведнасць з Законам № 200-З статуты арганізацый фізічнай культуры і спорту дзейнічаюць у частцы, якая не супярэчыць Закону № 200-З.

**Аб садоўніцкіх таварыствах**

30 мая 2023 г. выдадзены Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб садоўніцкіх таварыствах» № 155 (далей - Указ), які ўступіў у сілу 2 снежня 2023 г.

Пры гэтым Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 студзеня 2008 г. № 50 «Аб мерах па ўпарадкаванню дзейнасці садоўніцкіх таварыстваў» страціць сілу з даты ўступлення ў сілу Указа.

Згодна з пунктам 3 Указа садоўніцкія таварыствы, зарэгістраваныя да ўступлення ў сілу Указа, абавязаны на працягу аднаго года пасля ўступлення яго ў сілу прывесці свае статуты ў адпаведнасць з гэтым Указам і прадставіць у рэгіструючыя органы дакументы для дзяржаўнай рэгістрацыі змяненняў і (або) дапаўненняў, якія ўносяцца ў статуты. Статуты таварыстваў да прывядзення іх у адпаведнасць з гэтым Указам дзейнічаюць у частцы, якая яму не супярэчыць.

**Формы заяў**

1 кастрычніка 2023 г. уступіла ў сілу пастанова Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад 29 жніўня 2023 г. № 50 «Аб змяненні пастаноў Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад 27 студзеня 2009 г. № 8 і ад 10 сакавіка 2009 г. № 25», якой скарэкціраваны формы заяў (паведамленняў), якія прадстаўляюцца ў рэгіструючыя органы для дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі (спынення дзейнасці) суб'ектаў гаспадарання.